# ВІРТУАЛЬНАЯ ВЫСТАВА ЯК АКТУАЛЬНЫ ПРАДУКТ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

# VIRTUAL EXHIBITION IS AS A CURRENT PRODUCT OF LIBRARY ACTIVITIES

***Забалотная Ірына Уладзіміраўна*** *– бібліятэкар ІІ катэгорыі, магістр культуралогіі, Фундаментальная бібліятэка БДУ (Рэспубліка Беларусь), e-mail: Irinali3@gmail.com*

***Zabalotnaya Iryna*** *– librarian II rank, Master of cultural studies, Fundamental library BSU (Belarus), e-mail: Irinali3@gmail.com*

***Анатацыя.*** *Віртуальная экспазіцыя выступае своеасаблівай рэкламай аднайменнай кніжнай выставы. Гэта крок да віртуальных карыстальнікаў, крэатыўны спосаб раскрыцця фонду і рэкламы бібліятэкі. У дакладзе разглядаецца роля віртуальнай выставы ў бібліятэчнай дзейнасці, а таксама пытанні па стварэнні віртуальных выстаў у аддзеле інфармацыйнага абслугоўвання вучэбнага працэсу ФБ БДУ.*

***Abstract.*** *Virtual exhibition is as an advertisement for the book exhibition of the same name. It's a step to virtual users, a creative way of revealing the fund and advertising of the library. The article discusses the role of the virtual exhibition in the library business and also questions on the creation of virtual exhibitions in the educational process information services department of the FL BSU.*

***Ключавыя словы.*** *Віртуальная выстава, экспазіцыя, інфармацыя, гісторыя і культура Беларусі.*

***Keywords.*** *Virtual exhibition, exhibition, information, history of Belarus, culture of Belarus.*

Віртуальная выстава – гэта публічная дэманстрацыя спецыяльна падабраных дакументаў і інфармацыі па вызначанай тэматыцы ў сетцы Інтэрнэт з дапамогай інтэрнэт-сродкаў.

Канечне, віртуальная выстава – не новая форма працы, але гэта вельмі эфектыўны спосаб прад'яўлення інфармацыі. Электронная экспазіцыя – гэта крок да віртуальных карыстальнікаў, крэатыўны спосаб раскрыцця фонду і рэкламы бібліятэкі. Такая выстава выступае актуальным правадніком для карыстальніка ў вялікай плыні інфармацыі. Дакументы і матэрыялы з'арыентуюць чытача ў пошуку неабходнай літаратуры. Да таго ж, віртуальныя экспазіцыі даступныя для прагляду дваццаць чатыры гадзіны ў суткі, сем дзён на тыдзень. Такія выставы сталі найбольш запатрабаванымі з пачатку пандэміі, паколькі яны даюць магчымасць карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэкі на адлегласці.

Спынімся на віртуальных выставах, якія распрацоўваюцца ў аддзеле інфармацыйнага абслугоўвання вучэбнага працэсу ФБ БДУ. Віртуальную

выставу па вызначанай тэматыцы прэзентуем адначасова з кніжнай (з аднайменнай назвай). Тым самым віртуальная экспазіцыя выступае своеасаблівай рэкламай аднайменнай кніжнай выставы. Аднак, у адрозненне ад кніжных, віртуальныя выставы, якія ствараюцца ў аддзеле інфармацыйнага абслугоўвання вучэбнага працэсу ФБ БДУ, пачынаюць карыстацца ўсё большым поспехам. Такія выставы з’яўляюцца невялікім аповедам па пэўнай тэматыцы, усе элементы якога лагічна звязаны паміж сабой і суправаджаюцца музыкай.

У працэсе стварэння віртуальных экспазіцый асноўную ўвагу акцэнтуем на папулярызацыі беларускай мовы, мастацтва і літаратуры, актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў, захаванні самабытнасці роднай культуры і перадачы наступным пакаленням. У такіх выставах перш за ўсё рэпрэзентуем беларускіх дзеячаў гісторыі і культуры, мастацкія і архітэктурныя помнікі, цікавыя біяграфічныя і гісторыка-культурныя факты, якія малавядомыя шырокай аўдыторыі карыстальнікаў. Усе нашы выставы суправаджаюцца музыкальным афармленнем (напрыклад, «Слаўны сын беларускага народа: да 120-годдзя з дня нараджэння А.Н. Сеўчанка (Да заснавання БДУ)» – гімн БДУ, «Минск – город, который мы не видели» – М. Сацура «На вуліцах Мінска»).

Выставы экспануюцца не толькі на ўніверсітэцкім сайце, але і на ютуб-канале Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, што дазваляе ахапіць больш шырокую аўдыторыю карыстальнікаў (не толькі студэнты, выкладчыкі, але і ўсе, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі). Пра гэта сведчыць колькасць праглядаў віртуальных выстаў.

Віртуальная экспазіцыя «Слаўны сын беларускага народа: да 120-годдзя з дня нараджэння А.Н. Сеўчанка (Да заснавання БДУ)» прысвечана заслужанаму дзеячу навукі БССР, акадэміку, прафесару, рэктару БДУ А.Н. Сеўчанка. Раскрываюцца асноўныя факты біяграфіі і яго заслугі перад універсітэтам.

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца віртуальныя выставы пра Мінск: «Минск – город, который мы не видели» і «Минск: история в лицах». Першая экспазіцыя рэпрэзентуе невядомыя факты не толькі пра выдатныя мясціны горада, архітэктурныя помнікі, але і цікавыя гісторыі, звязаныя з імі (дом Ваньковічаў, ратуша, Чырвоны касцёл, Асмалоўка і інш.). Апошняя выстава выяўляе выбітных дзеячаў гісторыі і культуры, жыццё якіх было звязана з Мінскам, чые імёны засталіся ў памяці горада (напрыклад, К. Гутэн-Чапскі – гарадскі галава з 1890г. па 1901г., У. Пічэта – першы рэктар БДУ, С. Станюта – актрыса-легенда, народны мастак Беларусі М. Савіцкі, Мітрапаліт Філарэт і інш.).

У віртуальнае падарожжа па роднаму краю запрашае выстава «Помнікі гісторыі культуры Беларусі». У экспазіцыі выкарыстаны дакументы з фондаў ФБ БДУ, прысвечаныя культурнай спадчыне нашай краіны (Полацкі Сафійскі сабор, крыж Ефрасінні Полацкай, Каложская царква, Сынкавічская

царква-крэпасць, палац Пуслоўскіх у Косаве і інш.). Нягледзячы на складаную гісторыю, поўную войнаў і разбурэнняў, помнікі архітэктуры, якія захаваліся на тэрыторыі Беларусі – сапраўдныя каштоўнасці, некаторыя з іх унесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Імклівы час дадае ім яшчэ больш самабытнасці. Выстава знаёміць з архітэктурнымі помнікамі раманскага стылю і готыкі, барока і класіцызму, мадэрна і эклектыкі, прыводзяцца цікавыя факты з гісторыі збудаванняў, а таксама легенды, звязаныя з імі.

Віртуальная выстава «Зберагаючы самабытнасць (з гісторыі беларускага фальклору)» прысвечана жанравай разнастайнасці нацыянальнага фальклору (загадкі, казкі, прыказкі, прымаўкі, песні, прыпеўкі, легенды і паданні). Беларускі фальклор – гэта культура нашых продкаў, якая фармавала нацыянальную свядомасць беларусаў, развівала іх мастацкія здольнасці ў час адпачынку і пры выкананні некаторых работ (напрыклад, жніва), выконвала юрыдычную функцыю (пры дапамозе сямейных абрадаў, вяселля – замацоўвала права стварэння новай сям'і, радзін – надавала нованароджанаму статус чальца роду, сям'і), выступала сродкам народнай педагогікі. У выставе-прэзентацыі выкарыстаны дакументы з фонду ФБ БДУ. Ілюстрацыі узяты з кнігі «Чароўны свет» (мастак В. Славук).

Цікавасць у карыстальнікаў выклікае апошняя віртуальная выстава «Мастацкая спадчына Язэпа Драздовіча (да 135-годдзя з дня нараджэння Я. Драздовіча)», падрыхтаваная да 135-годдзя з дня нараджэння беларускага мастака, скульптара, этнографа і пісьменніка. У віртуальнай экспазіцыі прадстаўлены дакументы пра жыццё і творчасць мастака з фондаў ФБ БДУ, а таксама рэпрадукцыі карцін мастака. Творчасць Я. Драздовіча не характэрна для беларускай культуры, паколькі ён быў не толькі таленавітым мастаком і скульптарам, але і выдатным пісьменнікам, паэтам, настаўнікам, этнографам, фалькларыстам, філосафам, хірамантам, археолагам, тэатральным дзеячам, астраномам-аматарам і заснавальнікам беларускай тэарэтычнай астраноміі. Адсюль і фенаменальнасць яго творчасці. Пётр Сергіевіч, беларускі мастак, сучаснік Я. Драздовіча назваў творца «нашым маленькім павятовым Леанарда да Вінчы». Астранамічныя гіпотэзы і мары Я. Драздовіча пра палёты ў касмічную прастору рэалізаваліся і працягваюць развівацца. «Прыйдзе час... Мяне яшчэ пашукаюць», – гаварыў мастак. Яго прадказанні збыліся.

Такім чынам, віртуальныя выставы з дапамогай інтэрнэт-сродкаў спрыяюць папулярызацыі працы аддзела інфармацыйнага абслугоўвання вучэбнага працэсу ФБ БДУ і кніжнага фонду бібліятэкі, пашырэнню чытацкага светапогляду, дапамагаюць карыстальнікам ў падборы інфармацыі па патрэбнай тэматыцы.